ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (1069) ● Чацвер, 14 лістапада 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

● ЮБІЛЕЙ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ● НОВАЯ КАФЕДРА ● КАНФЕРЭНЦЫЯ БІБЛІЯТЭКАРАЎ ● АХОВА ПРЫРОДЫ ● ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ

# 40 ГОД ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ

СПОЎНІЛАСЯ 40 год з дня адкрыцця гістарычнага факультэта нашага універсітэта. Ён быў створан у адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад 16 мая 1934 г. «Аб выкладанні грамадзянскай гісторыі ў школах СССР», якая адкрыла новы этап у развіцці гістарычнай навукі, садзейнічала ператварэнню гісторыі ў магутны сродак выхавання савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Перад гістарычным факультэтам былі пастаўлены важныя і адказныя задачы: рыхтаваць кадры настаўнікаў гісторыі для сярэдняй школы, фарміраваць марксісцка-ленінскі светапогляд, камуністычную свядомасць і высокія маральныя якасці ў маладых спецыялістаў, выхоўваць іх актыўнымі будаўнікамі камуністычнага грамадства.

У 1934 годзе па пуцёўках органаў народнай асветы, партыйных і камсамольскіх арганізацый на першы курс гістарычнага факультэта было залічана 90 студэнтаў. Для паспяховага ажыццяўлення вучэбнай і навуковай работы былі створаны кафедры гісторыі СССР і БССР, кафедра гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, а ў 1937 годзе—кафедра новай і навейшай гісторыі. Пры універсітэце была адкрыта аспірантура, закліканая рыхтаваць высокакваліфікаваныя навуковыя кадры для вышэйшых навучальных і навукова-даследчых устаноў рэспублікі.

У перадваенныя гады на факультэце працавалі такія буйныя вучоныя, як акадэмік В. К. Шчарбакоў, прафесары М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, дацэнты Д. А. Дудкоў, К. і. Кернажыцкі, І. Ф. Лочмель, А. П. П'янкоў, Л. М. Шнеерсон і іншыя, якія ўнеслі вялікі ўклад у арганізацыю работы факультэта ў перыяд яго станаўлення.

У 1939-1940 гг. адбыліся першыя два выпускі высокакваліфікаваных спецыялістаў-гісторыкаў. 180 выхаванцаў факультэта былі накіраваны на работу ў народную гаспадарку, ва ўстановы асветы і культуры рэспублікі. Факультэт рыхтаваўся да трэцяга выпуску маладых спецыялістаў. Ішлі дзяржаўныя экзамены. Але вераломны напад фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз перапыніў стваральную працу савецкіх людзей. Пачалася Вялікая Айчынная вайна.

З першых дзён вайны многія навуковыя работнікі, аспіранты, студэнты пайшлі на фронт і ў партызанскія атрады, каб са зброяй у руках абараняць Айчыну. Многія з іх аддалі сваё жыццё ў барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. Некаторыя супрацоўнікі і студэнты факультэта эвакуіраваліся ўглыб краіны, дзе напружана працавалі ў навуковых установах, школах, калгасах і саўгасах, разам з усім народам кавалі перамогу над ворагам.

Восенню 1943 года на ст. Сходня пад Масквой была адноўлена работа універсітэта. У гэты перыяд са студэнтамі-гісторыкамі разам з супрацоўнікамі факультэта вялі работу вучоныя Масквы і Маскоўскага універсітэта: акадэмікі Н. С. Дзяржавін, А. М. Панкратава, прафесары А. А. Савіч, Б. А. Рыбакоў і іншыя. Маскоўскі універсітэт прадаставіў студэнтам старэйшых курсаў сваю бібліятэку і вучэбныя памяшканні.

Пасля вызвалення Савецкай Арміяй тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў БДУ аднавіў сваю работу ў Мінску. За пасляваенныя гады адноўлены разбураныя і пабудаваны новыя светлыя і прасторныя вучэбныя карпусы, лабараторыі, інтэрнаты, базы для практыкі студэнтаў. Бурна развіваўся ў гэтыя гады і гістарычны факультэт, рос кантынгент студэнтаў і калектыў навуковых работнікаў, удасканальвалася вучэбная, выхаваўчая і навуковая работа.

У цяперашні час на трох аддзяленнях — гістарычным, філасофскім і палітычнай эканоміі — вучыцца 2416 студэнтаў, у тым ліку па дзённай форме навучання—825, па завочнай — 1093 і па вячэрняй — 498. Вядзецца падрыхтоўка выкладчыкаў гісторыі, філасофіі, палітэканоміі і грамадазнаўства для сярэдніх навучальных устаноў, навуковых супрацоўнікаў архіваў, музеяў і навукова-даследчых інстытутаў. Выпускнікі факультэта працуюць на партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай рабоце, ва ўстановах культуры, а таксама ў сацыялагічных лабараторыях.

Лепшыя са студэнтаў па рэкамендацыі савета факультэта маюць магчымасць пасля заканчэння універсітэта паступаць у аспірантуру, рыхтавацца да навуковай дзейнасці па розных галінах гісторыі і дапаможных гістарычных дысцыплінах, а таксама па марксісцка-ленінскай філасофіі, сацыялогіі і палітычнай эканоміі.

На факультэце працуе вялікі калектыў высокакваліфікаваных спецыялістаў: 5 дактароў навук, прафесараў, 30 кандыдатаў навук, 20 старшых выкладчыкаў і выкладчыкаў.

Заняткі са студэнтамі вядуць такія вядомыя вучоныя, як члены-карэспандэнты Акадэміі педагагічных навук СССР прафесары Л. С. Абецэдарскі, С. А. Умрэйка, члены-карэспандэнты АН БССР прафесары У. М. Сікорскі, В. І. Сцяпанаў, прафесары П. О. Пузікаў, Г. П. Давідзюк, А. С. Кляўчэня, Г. М. Ліўшыц, Ф. М. Нячай, Г. М. Трухноў, Л. М. Шнеерсон, дацэнты М. П. Баранава, У. К. Драчоў, Д. Б. Мельцар, В. Н. Рабцэвіч, П. З. Савачкін і многія іншыя.

Вялікую палітыка-выхаваўчую работу праводзяць партыйная і грамадскія арганізацыі.

Для самастойнай работы студэнтаў, акрамя вучэбных кабінетаў, ёсць на факультэце добра аснашчаная тэхнічнымі сродкамі фота-кіналабараторыя, у якой сіламі прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў робяцца дыя- і кінафільмы па агульных і спецыяльных курсах. На факультэце абсталяваны дзве кінадэманстрацыйныя залы, дзе студэнты сістэматычна праглядаюць навуковыя і навукова-папулярныя кінафільмы і дыяфільмы.

Падрыхтоўка спецыялістаў на факультэце мае на мэце не толькі ўзбраенне студэнтаў ведамі, але і выпрацоўку ў іх навыкаў самастойнага навуковага даследавання. Вялікую ролю ў гэтым адыгрываюць студэнцкія навукова-даследчыя гурткі, якія працуюць пры кожнай кафедры. Тэматыка іх работы ахоплівае найбольш актуальныя і важныя праблемы гісторыі КПСС, айчыннай і зарубежнай гісторыі, марксісцка-ленінскай філасофіі і палітычнай эканоміі.

Вучоба на факультэце — гэта не толькі заняткі ў аўдыторыях. Археалагічная і вытворчая практыка, стажыроўка на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, сацыялагічных лабараторыях, архівах, музеях і навукова-даследчых інстытутах — важнейшыя элементы падрыхтоўкі гісторыкаў, філосафаў і палітэканомаў.

Гістарычны факультэт змог многага дабіцца ў вырашэнні задач, пастаўленых Цэнтральным Камітэтам партыі і Савецкім урадам па падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў настаўнікаў сярэдніх школ, выкладчыкаў ВНУ і супрацоўнікаў навуковых устаноў. За 40 год на факультэце падрыхтавана каля чатырох тысяч спецыялістаў, якія паспяхова працуюць у галіне народнай гаспадаркі, культуры, навукі і асветы, на партыйнай, камсамольскай і савецкай рабоце. Сярод іх — загадчык аддзела ЦК КПСС П. А. Абрасімаў, загадчык аддзела навукі ЦК КПБ А. Ц. Караткевіч, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, намеснік загадчыка аддзела навукі ЦК КПБ Я. М. Бабосаў, міністр асветы БССР М. Г. Мінкевіч, намеснік начальніка галоўнага метадычнага ўпраўлення Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР Р. Т. Аблова і іншыя.

Вялікі ўклад унёс факультэт у справу падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі — дактароў і кандыдатаў навук. Толькі за пасляваенныя гады каля 200 выпускнікоў факультэта падрыхтавалі і абаранілі доктарскія і кандыдацкія дысертацыі і паспяхова працуюць рэктарамі, прафесарамі, дацэнтамі ў вышэйшых навучальных установах, навуковымі супрацоўнікамі ў навукова-даследчых установах рэспублікі і за яе межамі. Кафедры гістарычнага факультэта, а таксама кафедры грамадскіх навук у большасці ўкамплектаваны выпускнікамі факультэта.

У цяперашні час савецкі народ напружана працуе над выкананнем заданняў дзевятай пяцігодкі. 40-годдзе гістарычнага факультэта БДУ супала з чацвёртым, вызначальным годам пяцігодкі. Адзначаючы свой юбілей новымі дасягненнямі, калектыў факультэта поўны гарачага жадання вырашыць задачы, пастаўленыя Цэнтральным Камітэтам партыі і Савецкім урадам перад работнікамі вышэйшай школы.

**А. ІГНАЦЕНКА,**
**намеснік дэкана гістарычнага факультэта.**

## ГІСТФАК ПЕРАДСВЯТОЧНЫ

**Пад дэвізам «40 год гістарычнаму факультэту» ў групах пройдуць урачыстыя сустрэчы выкладчыкаў і студэнтаў.**

***

**На свята запрошаны выпускнікі факультэта мінулых год навучання, сябры з іншых ВНУ рэспублікі.**

***

**У дзень свята адбудзецца вялікі канцэрт, падрыхтаваны студэнтамі. У першакурснікаў будзе дэбютаваць вакальна-інструментальны ансамбль; IV курс пакажа літаратурна-музычную кампазіцыю.**

***

**Ідзе афармленне ганаровай Дошкі выпускнікоў факультэта, Дошкі выдатнікаў, рыхтуецца выстаўка дакументальных матэрыялаў і навуковых работ супрацоўнікаў, святочны выпуск насценнай газеты «Гісторык».**

***

**Падведзены вынікі трэцяга, працоўнага семестра. Лепшым сярод СБА гістфака прызнан будатрад імя Ленінскага камсамола.**

## У КАМІТЭТАХ КАМСАМОЛА

**З 11 лістапада па 6 снежня на будоўлях Мінска будуць працаваць лепшыя байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў БДУ, якія добра ведаюць тэхніку бяспекі і маюць неабходныя навыкі.**

**Студэнты за гэты час акажуць дапамогу будаўнікам сталіцы і адначасова яшчэ больш удасканаляць свае будатрадаўскія прафесіі.**

**Камітэт камсамола універсітэта арганізуе на будаўнічых пляцоўках вучэбныя палігоны, дзе байцы СБА змогуць атрымаць новую будаўнічую прафесію. Гэта дапаможа ім сустрэць у баявой гатоўнасці наступны працоўны семестр.**

**Па графіку кожны дзень на будоўлях горада будуць працаваць па 150 студэнтаў з розных факультэтаў.**

***

Да наступнага працоўнага лета ўжо пачалі рыхтавацца камсамольцы гістарычнага факультэта. Аб гэтым паведаміў на пасяджэнні камітэта камсамола гістфака А. Буры. Другое пытанне, якое разглядалася на пасяджэнні, — вынікі грамадска-палітычнай атэстацыі студэнтаў.

***

**Чарговыя заняткі школы групкамсоргаў правяла на біяфаку Таня Працько, вопытны камсамольскі работнік, былы сакратар камітэта камсамола фізічнага факультэта. Тэма заняткаў — «Часовыя і пастаянныя даручэнні, кантроль за іх выкананнем».**

***

Камітэт камсамола універсітэта рыхтуецца да пленума, які будзе праведзен сумесна з кафедрай гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў. Будзе абмеркавана арганізацыя самастойнай работы студэнтаў філалагічнага факультэта над творамі класікаў марксізму-ленінізму.





● Вітаючы свята Вялікага Кастрычніка, разам з усімі працоўнымі Мінска прайшлі ў калонах дэманстрантаў па ўпрыгожаных вуліцах і плошчах сталіцы студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта. У іх добрым настроі — гонар за поспехі, дасягнутыя дзякуючы дружным намаганням, добрасумленнай працы.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

## САСТАЎ МЯСЦОВАГА КАМІТЭТА ПРАФСАЮЗА БДУ

1. АНУФРЫЕЎ Яўген Міхайлавіч.
2. БАРКОЎСКІ Леанід Міхайлавіч.
3. ЖУК Аляксандр Аляксандравіч.
4. ЗАПОЛЬСКАЯ Тэліна Іванаўна.
5. ЗАХАРАВА Вера Анісімаўна.
6. ІШЧАНКА Анатоль Сяргеевіч.
7. КАРАЛЕНКА Іван Кузьміч (старшыня палітыка-выхаваўчай камісіі).
8. КЛІМОВІЧ Валерый Сцяпанавіч.
9. КЛІЦУНОВА Натэла Канстанцінаўна.
10. ЛАПО Міхаіл Цімафеевіч.
11. МАНАСТЫРНЫ Пётр Ільіч.
12. НАРКЕВІЧ Аркадзь Іосіфавіч.
13. ПАЛЬЦАЎ Аляксандр Аляксандравіч (старшыня вытворчай камісіі).
14. ПЛЯХАНАЎ Пётр Фёдаравіч (намеснік старшыні МК).
15. РАМАНЕНКА Уладзімір Андрэевіч.
16. РОГАЧ Леанід Пятровіч.
17. РОДЗІН Іван Георгіевіч (старшыня МК).
18. САКОВІЧ Дзмітрый Мікалаевіч (старшыня спартыўна-масавай камісіі).
19. САРЖЭЎСКІ Аляксандр Міхайлавіч.
20. СТУКАНАЎ Аляксандр Аляксандравіч.
21. ХАПАЛЮК Аляксандр Пятровіч.
22. ШАЛІМА Валерый Мікалаевіч.
23. ШЫБАЕВА Ганна Васільеўна (старшыня жыллёва-бытавой камісіі).
24. ШЧУКІН Георгій Лукіч (старшыня камісіі па тэхніцы бяспекі).
25. ЯЙСО Вікторыя Ігнацьеўна.

# ЗАДАЧЫ І ПЛАНЫ НОВАЙ КАФЕДРЫ

На біялагічным факультэце БДУ з 1 верасня гэтага года пачала працаваць кафедра агульнай экалогіі, гідрабіялогіі і аховы прыроды.

Арганізацыя гэтай кафедры з'яўляецца канкрэтнай рэалізацыяй палітыкі партыі і ўрада, накіраванай на забеспячэнне рацыянальнага выкарыстання, аховы і ўзнаўлення прыродных рэсурсаў, на паляпшэнне якасці асяроддзя жыцця для ўсіх членаў грамадства.

Перад створанай кафедрай пастаўлены наступныя асноўныя задачы: забяспечыць падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі па ахове прыроды; падрыхтоўку гідрабіёлагаў; выкладанне курса аховы прыроды на ўсіх факультэтах універсітэта і ў іншых ВНУ г. Мінска, якія не маюць адпаведных спецыялістаў; разгарнуць даследаванне праблем агульнай экалогіі і гідрабіялогіі як навуковай асновы рашэння практычных задач аховы прыроды і рацыянальнага выкарыстання біялагічных рэсурсаў.

У рашэнні гэтых задач кафедра абапіраецца на багаты вопыт гідрабіялагічных даследаванняў, набыты ў нашым універсітэце за апошнія 30 гадоў. Гідрабіялогія, як вядома, з'яўляецца састаўной часткай агульнай экалогіі, яе ідэі і метады зараз шырока прымяняюцца ў вывучэнні наземных і глебавых біяцэнозаў.

Развіццё экалогіі ў цяперашні час узмацняецца ва ўсім свеце. Гэта дыктуецца рэзкім абвастрэннем канфлікту паміж ростам спажывання прыродных рэсурсаў і якасцю навакольнага асяроддзя, якое прыкметна пагаршаецца ў многіх прамыслова развітых краінах капіталістычнага свету. Калі не прыняць тэрміновых мер па ахове асяроддзя жыцця, канфлікт, які намеціўся, можа перарасці ў глыбокі экалагічны крызіс.

Урбанізацыя пасяленняў (рост гарадоў), індустрыялізацыя ўсіх відаў вытворчасці і рост насельніцтва, якія суправаджаюць навукова-тэхнічную рэвалюцыю, разам з неабвержнымі дабротамі цывілізацыі нясуць з сабой рэзкае павелічэнне ўсіх відаў забруджвання навакольнага асяроддзя, вод, паветра і глебы, скарачэнне традыцыйных відаў карысных выкапняў і біялагічных рэсурсаў біясферы. Напрыклад, на кожнага жыхара прамыслова развітых краін зараз расходуецца (і забруджваецца) больш 15 куб. м вады ў суткі, больш 50 т усіх відаў выкапняў у год і каля 10000 ват энергіі. Гадавая вытворчасць бытавога смецця і адходаў складае 2 тоны на душу насельніцтва.

Знайсці метады аховы біясферы, захавання яе раўнавагі і стварэння гармоніі паміж людзьмі і навакольным асяроддзем — важнейшая задача экалогіі.

У нашай краіне прымаюцца пэўныя меры для рашэння экалагічных праблем як унутры краіны, так і ў плане міжнароднага супрацоўніцтва.

У выкладчыкаў кафедры агульнай экалогіі ёсць вопыт супрацоўніцтва ў рашэнні экалагічных праблем з іншымі ВНУ і навуковымі ўстановамі Савецкага Саюза і за мяжой, у прыватнасці па Міжнароднай біялагічнай праграме.

Да выкладчыцкай работы на кафедры прыцягваюцца спецыялісты сумежных кафедр біялагічнага, геаграфічнага і юрыдычнага факультэтаў, вучоныя праблемнай лабараторыі эксперыментальнай біялогіі БДУ і Акадэміі навук БССР.

Кафедра намячае забяспечыць студэнтам, якія спецыялізуюцца па гідрабіялогіі і ахове прыроды, праходжанне марской практыкі на базах МГУ на Чорным і Белым морах, у запаведніках і запаведна-паляўнічых гаспадарках, шырокі ўдзел у навукова-даследчых экспедыцыях з тым, каб рыхтаваць спецыялістаў на глыбокай агульнаэкалагічнай аснове, здольных рашаць складаныя задачы аховы навакольнага асяроддзя і весці выхаваўчую работу сярод насельніцтва.

У цяперашні час удакладняюцца планы і праграмы спецкурсаў па абедзвюх спецыялізацыях, распрацоўваюцца праграмы навукова-даследчых работ, вызначаюцца базы для праходжання практыкі, абсталяванне для вучэбных і навукова-даследчых памяшканняў кафедры.

У нас многа цяжкасцей, але дружны калектыў кафедры з дапамогай рэктарата і грамадскіх арганізацый універсітэта безумоўна пераадолее іх і забяспечыць выкананне задач, пастаўленых перад кафедрай.

**У. ЛЯХНОВІЧ,**
**загадчык кафедры.**



**НА ЗДЫМКУ:** ідзе пасяджэнне кафедры. Фота А. ЦЫГУЛЁВА.

# ТВОЙ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ

Старшакурснік, актывіст факультэта, выдатнік вучобы, добры таварыш. Ён умела спалучае вучобу з грамадскай дзейнасцю і адпачынкам, распараджаецца сваім рабочым днём так, што на ўсё ў яго хапае часу...

У пошуках таго, хто б падзяліўся вопытам арганізацыі рабочага дня з многімі студэнтамі і ў першую чаргу, з першакурснікамі, я прыйшла ў аўдыторыю, дзе займаецца III курс юрыдычнага факультэта.

«Іван Аленчык — камсорг групы. Ён і выдатна вучыцца, і актывіст, і арганізатар, і добры таварыш», — падказалі студэнты.

Даведаўшыся пра мэту майго наведання, Іван расказаў:

— Сапраўды, у пачатку вучобы даволі цяжка размеркаваць свой час. Але хачу сказаць адно: галоўнае для студэнта — рэжым, якога, трэба прытрымлівацца ўвесь час.

**— А ці існуе ў вас такі рэжым?**

— Вядома. Да яго я прывучыў сябе яшчэ з дзяцінства. Спачатку, канешне, было нялёгка. Трэба ж у адпаведны час уставаць, рыхтаваць урокі. Часам па тэлевізару дэманструецца цікавы фільм, хочацца яго паглядзець, а ў цябе ў раскладзе ў 22 гадзіны сон. Давялося прымушаць сябе, шукаць сілы, каб кіраваць сваімі жаданнямі.

**— А які вынік дало ўсё гэта?**

— Добра вучыўся ў школе, закончыў з адзнакай машынабудаўнічы тэхнікум у Гомелі. Галоўнае, што ў мяне на ўсё хапала часу. Нават у арміі мне было лягчэй. Я прывык к рэжыму, і ваенная дысцыпліна яшчэ больш загартавала мяне.

Так, сапраўды, ён стаў у арміі палітінфарматарам, лепшым знаўцам сваёй справы. Тут яго прынялі ў рады КПСС.

**— А што вам дапамагае вучыцца?**

— Зноў той жа рэжым дня, які я складаю на тыдзень. Вядома, не заўсёды ўдаецца яго строга прытрымлівацца, але стараюся.

**— Напэўна, многа ў вас і грамадскіх даручэнняў?**

— Так, я камсорг групы. І павінен ведаць кожнага студэнта нашай групы не толькі як студэнта, але і як чалавека: яго душу, характар, патрэбы.

Многа спраў у мяне як у члена камітэта камсамола факультэта, намесніка сакратара па ідэалагічнай рабоце.

Яшчэ я і член савета інтэрната.

**— Сапраўды, спраў многа. Ці не перашкаджае гэта вучобе?**

— Наадварот, дапамагае. Будучаму юрысту такая занятасць толькі на карысць: вучышся працаваць з людзьмі, узбагачаеш свой кругагляд.

Праўда, здаецца, недастаткова аддаю ўвагі вучобе. У час летняй сесіі ў мяне было дзве чацвёркі. Зараз паставіў мэту: закончыць трэці курс толькі на выдатна.

**— Вядома, гэта зноў звязана з рэжымам дня?**

— Але ў ім я пастараюся адшукаць тыя хвіліны, што ўсё ж прападаюць дарэмна, і рэжым яшчэ больш удакладню.

**— Вучоба, грамадскія даручэнні—далёка не ўсё ў вашым жыцці?**

— Вядома, я люблю тэатр, музыку. Шмат чытаю, бываю ў музеях. Нават, — ён, смеючыся, дадае: — Хаджу на спатканні.

**— І апошняе пытанне: што б вы пажадалі тым, хто ўпершыню пераступіў парог універсітэта?**

— Па-першае, вучыцца толькі на добра і выдатна. Калі паступіў, то ўсю энергію аддай вучобе, ведам, каб гэтыя пяць гадоў не прайшлі дарэмна.

Па-другое, і гэта, бадай, самае галоўнае, трэба ўмець распараджацца сваім рабочым часам. Як ты зможаш арганізаваць свой час, у якое рэчышча яго накіруеш, — ад гэтага залежаць твае поспехі ў вучобе.

І, па-трэцяе, традыцыйнае студэнцкае: «Ні пуху, ні пер'я!».

**Л. БАРАН,**
**студэнтка.**







● Геафак сустрэў свята поспехамі ў навуковай рабоце, павышэннем паспяховасці, лепшай арганізацыяй вытворчай практыкі студэнтаў.

● Пэўнымі дасягненнямі ў навуковай рабоце сустрэў свята Кастрычніка хімічны факультэт. На рэспубліканскі агляд-конкурс хімікі прадставілі 74 студэнцкія навуковыя работы.

Шматлікія падзякі ад сельскіх працаўнікоў атрымаў калектыў факультэта за дапамогу ва ўборцы ўраджаю. Студэнты - хімікі сабралі з калгасных палеткаў 1950 тон бульбы.



**Паважаюць на філалагічным факультэце студэна III курса аддзялення рускай мовы і літаратуры Анатоля Гіруцкага, камуніста, сакратара партыйнай арганізацыі студэнтаў. У мінулым годзе ён быў намеснікам сакратара камітэта камсамола факультэта. Дзейны, ініцыятыўны, Анатоль улюбён у сваю прафесію — займаецца навуковай работай, наведвае гурток савецкай літаратуры.**

**За выдатную вучобу і актыўную грамадскую дзейнасць сёлета А. Гіруцкаму назначана імянная стыпендыя імя Якуба Коласа.**

**Фота А. Цыгулёва.**

# У ВНУ КРАІНЫ

● Аддзел друку Кішынёўскага дзяржаўнага універсітэта выдаў карысны дапаможнік «Практыкум па лацінскай мове для студэнтаў гісторыка-філалагічных факультэтаў ВНУ».

У дапаможніку шмат прыкладных сказаў, якія ілюструюць тую ці іншую граматычную з'яву. Пасля кожнага граматычнага раздзела практыкум патрабуе выканання асобных заданняў для замацавання матэрыялу.

(«Кишиневский университет», КДУ імя У. І. Леніна).

● Творчыя сувязі паміж калектывамі Беларускага політэхнічнага інстытута і Мінскага аўтамабільнага завода існуюць ужо даўно. Але жыццё патрабуе новых, больш дасканалых форм садружнасці вучоных і работнікаў вытворчасці, накіраваных на хутчэйшае ўкараненне ў вытворчасць дасягненняў навукі і тэхнікі, павышэнне эфектыўнасці навуковых даследаванняў, паскарэння на гэтай аснове навукова-тэхнічнага прагрэсу. Менавіта таму і было нядаўна створана навукова-вучэбна-вытворчае аб'яднанне «МАЗ—БПІ».

На сумесным пасяджэнні партыйных камітэтаў Мінскага аўтамабільнага завода і Беларускага політэхнічнага інстытута з удзелам адміністрацыі, вядучых спецыялістаў завода і вучоных інстытута былі абмеркаваны пытанні далейшага ўмацавання творчых сувязей абодвух калектываў.

(«Советский инженер», БПІ).

# ПА ПРАПАНОВАХ КАМІСІІ

НА ПАСЯДЖЭННІ прафбюро разгледжана работа метадычнай камісіі кафедры будовы рэчыва. Папярэдняй праверкай было ўстаноўлена, што ў мінулым навучальным годзе дзейнасць метадычнай камісіі прыкметна актывізавалася, стала больш змястоўнай і рэгулярнай. Асноўнае, што штурхнула павысіць узровень метадычнай работы, — гэта расшырэнне саставу кафедры і яе задач: яна стала забяспечваць курсы агульнай фізікі, якія чытаюцца на факультэце. Такім чынам, навукова-метадычная і вучэбна-педагагічная работа аказалася звязанай не толькі з пэўнымі спецкурсамі, але і з лекцыйнымі, практычнымі і лабараторнымі заняткамі па курсах агульнай фізікі.

Метадычная камісія, працуючы па вызначанаму плану, рыхтуе канструктыўныя прапановы па ўдасканаленню і павышэнню ўзроўню асобных лабараторных задач і практыкумаў у цэлым, па методыцы апрацоўкі вынікаў эксперыментальных даных, пастаноўцы новых работ, а таксама па методыцы выкладання найбольш складаных пытанняў лекцыйных курсаў.

У прыватнасці, падрыхтаваны да размнажэння апісанні і інструкцыі работ у лабараторным практыкуме па оптыцы і атамнай фізіцы. У другім семестры будуць падрыхтаваны дзве новыя работы.

Метадычная камісія прапанавала кафедры мерапрыемствы па паляпшэнню лабараторнага практыкуму па механіцы і малекулярнай фізіцы, улічваючы, што гэты практыкум прызначан дапамагчы студэнтам глыбей усвядоміць асноўныя фізічныя заканамернасці і набыць асноўныя навыкі эксперыментавання.

Камісія звярнула ўвагу на змест кіраўніцтва і апісання лабараторных задач, у якіх павінны ўтрымлівацца пэўныя ўказанні для ўзнаўлення эксперыменту. Гэта вельмі важна, бо не ўдаецца пазбегнуць некаторага апярэджання тэарэтычнага курса лабараторнымі заняткамі.

Ёсць у рабоце метадычнай камісіі і асобныя недахопы. Асноўны з іх: не зусім дакладнае афармленне планаў работы, дакументацыі і рэкамендацый. Камісія не плануе наведванне і абмеркаванне лекцый выкладчыкаў кафедры. У плане работы адсутнічаюць пытанні, звязаныя з паляпшэннем выкладання на вячэрнім аддзяленні; выпалі з поля зроку тэхнічныя сродкі навучання, педагагічная і вытворчая практыка, курсавыя і дыпломныя работы студэнтаў.

Прафбюро адзначыла гэтыя недахопы і рэкамендавала метадычным камісіям кафедр факультэта звярнуць на іх увагу.

**М. ГІЛЕВІЧ,**
**старшыня прафбюро.**

# НА ХІМФАКУ

## ПРЫРОДЫ ВЕРНЫЯ СЯБРЫ

Пытанні аховы прыроды настойліва прыцягваюць да сябе ўвагу маладых даследчыкаў БДУ. На факультэтах ствараюцца студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі (СНДЛ), тэматыка работы якіх цесна звязана з задачамі аховы навакольнага асяроддзя. Характэрна, што на хімфаку, напрыклад, студэнты канцэнтравалі свае даследаванні па пытаннях аховы прыроды на кафедры радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі. Таму яшчэ ў мінулым навучальным годзе, вясной, энтузіясты стварылі на базе кафедры СНДЛ, у якой разам са старшым навуковым супрацоўнікам Алай Міхайлаўнай Кавалеўскай студэнты вядуць цікавыя і карысныя распрацоўкі.

СНДЛ — самастойная арганізацыя, дзейнасцю якой кіруе савет СНТ хімфака і навукова-даследчы аддзел універсітэта. Маленькі калектыў выконвае даволі складаныя гаспадарча-дагаворныя заданні. Самастойнасць у рабоце актывізуе студэнтаў, павышае іх адказнасць, тым больш, што вынікі гэтых даследаванняў вельмі важныя для народнай гаспадаркі.

Зараз СНДЛ займаецца праблемамі аховы вадаёмаў ад забруджвання іх адходамі цэлюлозна - папяровай прамысловасці.

Ці трэба гаварыць, як важна захаваць чыстымі нашы рэкі і азёры! Тэма, над якой працуюць пяцікурснікі Вячаслаў Дземчанка, Вячаслаў Касабуцкі, Наташа Луцаева і Света Мацвеева, называецца «Радыяцыйная ачыстка сцёкавых вод у цэлюлозна-папяровай вытворчасці». Яна распрацоўваецца сумесна з Ленінградскім навукова - вытворчым аб'яднаннем цэлюлозна-папяровай прамысловасці.

Больш канкрэтныя задачы рашаюць члены СНДЛ для некаторых прадпрыемстваў нашай рэспублікі. Па дагавору з Полацкім хімкамбінатам студэнцкая лабараторыя распрацоўвае новы, радыяцыйны метад ачысткі яго сцёкавых вод, які дае больш эфектыўныя вынікі ў параўнанні з хімічным метадам, што прымяняецца ў Полацку зараз. Пры новай тэхналогіі не толькі паляпшаецца якасць ачысткі, але і ў дзесяткі разоў памяншаецца расход вады, таму што паяўляецца магчымасць зноў выкарыстоўваць яе ў вытворчых мэтах.

Акрамя таго, выявілася, што асадак, які выпадае пасля ачысткі вады, — выдатны сродак для апрацоўкі драўнінных адходаў. Ён надае выключную трываласць зробленым з іх драўнінна-пластычным матэрыялам.

Што ж, карыснасць работы СНДЛ для народнай гаспадаркі не трэба даказваць. А што яна дае менавіта самім студэнтам?

— Члены лабараторыі зацікаўлены работай, — расказвае Ала Міхайлаўна Кавалеўская. — Мэты яе вельмі канкрэтныя і зразумелыя. Думаецца, што члены СНДЛ, дзе б яны потым ні працавалі, што б ні рабілі, будуць улічваць вопыт, атрыманы ў лабараторыі.

Так што СНДЛ адыгрывае вялікую ролю і ў выхаванні будучых паўнацэнных спецыялістаў.

**Т. САХАШЧЫК.**

## РАСКАЗВАЕ НАСЦЕНКА

На другім паверсе хімфака заўсёды асабліва шумна і мнагалюдна, калі вывешваецца чарговы нумар газеты «Хімік». Як ідуць справы на факультэце, курсе, у групе, аб новых працах членаў студэнцкага навуковага таварыства—аб усім гэтым падрабязна расказвае насценгазета «Хімік».

Прыцягвае ўвагу сатырычны куток «Вучыся, студэнт», дзе высмейваюцца прагульшчыкі, злосныя парушальнікі вучэбнай дысцыпліны.

Старанна, удумліва працуюць над кожным нумарам Л. Рамашка (IV курс), В. Грыцук (V курс), Г. Грыко (II курс).

## ДОРАЦЬ РАДАСЦЬ

Агітбрыгада хімфака, у якую ўваходзяць студэнты III—IV курсаў, створана ў другім семестры 1973 навучальнага года. З праграмай, прысвечанай дню хіміка, агітбрыгадаўцы выступілі перад школьнікамі вёскі Ляхавічы Дзяржынскага раёна.

У час сустрэч са школьнікамі, моладдзю вёсак, гарадскіх пасёлкаў студэнты расказваюць аб сваім факультэце, аб вучобе, таварышах. Іх выступленні заўсёды прыносяць радасць гледачам.

Па запрашэнню камітэтаў камсамола хімічных факультэтаў ВНУ агітбрыгада выступала ў Харкаве, Кіеве, Ленінградзе, Маскве. За мастацкую распрацоўку тэмы студэнцкага жыцця яна неаднаразова ўзнагароджвалася граматамі. А ў 1973 годзе чатырнаццаць членаў агітбрыгады прэміраваны рэктаратам БДУ.

Для Я. Макарэвіча (кіраўнік агітбрыгады), А. Дзіжы, Л. Лушчыка, В. Ожэгава, Ж. Радзіён, Л. Манчанкі няма большай удзячнасці, чым вясёлыя ўсмешкі на тварах гледачоў, іх добры душэўны настрой пасля канцэртаў.

У лістападзе агітбрыгадаўцы выедуць з новай праграмай «Студэнт — хто ты ёсць?» у Віцебскую вобласць.

**А. ДАДАЛКА,**
**студэнтка II курса журфака.**





● Разам са старэйшымі сябрамі прайшлі па святочных вуліцах першакурснікі ФПМ. Папаўненне факультэта ў гэтым годзе лічыцца вельмі моцным. З 260 новых студэнтаў 112 — медалісты.

За дапамогу ва ўборцы ўраджаю гэтай восенню нямала падзяк атрымалі студэнты факультэта

● У калоне байцоў СБА прайшлі прадстаўнікі будаўнічых атрадаў матэматычнага факультэта, якімі гэтым летам было асвоена больш 400 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Ганарацца матэматыкі таксама добрымі вынікамі сельскагаспадарчых работ.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

СПРАВЫ ІНТЭРНАЦКІЯ

# «МАЁ» І «НАША»

Інтэрнат—наш дом. Гэтыя словы ўжо набылі нейкі афарыстычны сэнс. Але ці заўсёды мы ўдумваемся ў тое, што з такой лёгкасцю гаворым. Не, дома ніхто нават не падумае адчыняць дзверы, штурхаючы іх нагой, не возьмецца мыць бялізну ў тым пакоі, дзе спіць, не стане пераносіць смецце са спальні на кухню. Бо гэта ж яго дом, месца адпачынку, месца, дзе найбольш выражаецца акуратнасць гаспадара, яго, калі хочаце, мастацкі густ.

А ў пакоі інтэрната жывуць чатыры-пяць чалавек, тут усё не «маё», а «агульнае». Калідор у інтэрнаце наогул на добрую сотню жыхароў. Вось і стаіць уздоўж яго дым карамыслам з ранку да вечара (нягледзячы на тое, што ёсць месца для курэння). Вось і надрываюцца да дзвюх гадзін ночы транзістары, перашкаджаючы адпачываць не «мне», а «некаму». Калі ж хто-небудзь спрабуе заклікаць да парадку нетактоўнага, чуеш: «А што ты хацеў? Гэта ж інтэрнат, а не загарадная віла. Тут у кожнага свае інтарэсы, свой настрой!». Яно добра, канешне, калі ў кожнага свае інтарэсы, у кожнага сваё, на тое мы і людзі. Але побач з намі столькі такіх жа са сваім «я». І ніхто не даў нам права на залішнюю ўвагу да сваіх пачуццяў, ніколькі не шануючы іх у другім чалавеку!

Напэўна, такія разважанні прыходзяць не да ўсіх. А таму, на маю думку, не лішне было б стварыць у кожным інтэрнаце атрады ці дружыны—не важна, як іх называць,—цішыні і парадку. Каб яны былі афіцыйнымі, патрэбна на студсавеце выбраць у іх і зацвердзіць самых надзейных людзей. А пасля, пры праверках, пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва і прысваенні звання лепшага пакоя інтэрната ўлічваць заўвагі не толькі правяраючых агульны стан пакоя, але і прыслухоўвацца да думкі гэтага атрада. І калі нават пакой ва ўзорным парадку, а яго жыхары «круцяць» да світання магнітафон, то ці маюць яны права насіць званне лепшага пакоя?

Атрады цішыні і парадку павінны «працаваць» кругласутачна: дапамагаць дзяжурнаму па інтэрнату, супыняць неахайных «гаспадынь» на кухні, сачыць за парадкам на калідоры.

Гэта, аднак, не здымае адказнасці з кожнага жыхара за парадак «майго» інтэрната, «майго» калідора, «маёй» кухні, «майго» пакоя.

**Н. ПЯТРОЎСКАЯ,**
**інтэрнат № 3.**

# ВУЧОБА БІБЛІЯТЭКАРАЎ

Актыўны ўдзел у канферэнцыі маладых спецыялістаў прынялі ўсе камсамольцы бібліятэкі. Тэмы дакладаў былі сплаваны так, каб раскрыць змест працы маладых спецыялістаў, выявіць рэзервы часу для лепшага абслугоўвання чытачоў.

Дырэктар бібліятэкі І. У. Арэхоўская расказала аб ролі і месцы вузаўскіх бібліятэк, раскрыла галоўныя напрамкі і змест іх працы і звярнула асаблівую ўвагу на арганізацыю новых форм абслугоўвання: групавое абслугоўванне першакурснікаў, дні інфармацыі і дні кафедры і г. д.

Аб сістэме абслугоўвання завочнікаў расказала Г. Шапавальская. Яна паведаміла, што ў 1973-1974 навучальным годзе ад завочнікаў было атрымана 650 пісем-заказаў, выслана ім 1344 кнігі. Большая частка заказаў была задаволена.

Падрабязна спынілася Г. Шапавальская на рабоце з пісьмамі, падборы літаратуры і яе афармленні, расказала пра створаны спецыяльны фонд і яго папаўненне.

У лютым 1973 года студэнцкі аддзел перайшоў на новую форму работы — дыферэнцыраванае абслугоўванне. Адкрыты залы гуманітарных і прыродазнаўчых навук, кніжны фонд якіх складае каля 6.600 экземпляраў. Пра выгоды новай формы абслугоўвання расказалі Т. Куніцкая і Т. Міцюхіна.

Т. Казлова, Т. Ліпніцкая выказалі свае меркаванні, што датычаць удасканалення бібліятэчнай справы.

Г. Бачкова расказала пра гісторыю друкаванай карткі Усесаюзнай кніжнай палаты і яе ролю ў стварэнні даведачнага апарата бібліятэкі, а таксама пра вопыт работы з ім у бібліятэцы БДУ, а Н. Тыртышная — аб рабоце з карткамі ў аддзеле камплектавання.

Дырэктар бібліятэкі І. У. Арэхоўская падвяла вынікі канферэнцыі, адзначыла шэраг дакладаў, якія заслугоўваюць высокай адзнакі. Быў адобран гэты від вучобы маладых спецыялістаў.

**Т. МЕЛЬНІКАВА.**

# УМЕЙЦЕ ПРАЦАВАЦЬ

ПАРАДЫ ЎРАЧА

Вучэбны працэс у ВНУ прадугледжвае абавязковыя перапынкі пасля 45—50 мінут работы ў аўдыторыі. 5—10-мінутнага перапынку дастаткова для адпачынку пры ўмове правільнай яго арганізацыі. Не патрэбна выкарыстоўваць перапынак для чытання, падрыхтоўкі да наступнага віду работы, гульні ў шахматы. Лепш выйсці ў калідор і абавязкова праветрыць аўдыторыю, бо паступовае накапленне вуглекіслаты шкодна адбіваецца на працаздольнасці, памяці і ўвазе, можа спрыяць развіццю малакроўя.

Самападрыхтоўка студэнтаў павінна быць штодзённай, а не толькі напярэдадні сесіі. Яна таксама патрабуе пэўнай гігіенічнай арганізацыі.

Не трэба адразу ж пасля заняткаў рыхтавацца да наступнага працоўнага дня.

Лепшы адпачынак пасля заняткаў — гэта спорт, прагулкі на свежым паветры. Толькі пасля гэтага можна пачаць падрыхтоўку да практычных і семінарскіх заняткаў.

Важна ў перыяд самастойных заняткаў захоўваць рэжым работы ВНУ. Пасля беcперапыннай аднагадзіннай ці паўтарагадзіннай працы трэба адпачыць на працягу 5—10 мінут. У час перапынку карысна ўстаць, пацягнуцца, зрабіць некалькі лёгкадаступных фізічных практыкаванняў, прайсціся, праветрыць памяшканне.

Большая частка часу студэнта занята чытаннем, якое з'яўляецца адным са стамляючых відаў разумовай дзейнасці. Гігіена чытання прадугледжвае змену розных па зместу відаў вучэбнага матэрыялу.

Паўнацэннасць самастойнай працы вызначаецца правільным асвятленнем рабочага месца, позай студэнта за пісьмовым сталом, адпаведным парадкам на рабочым месцы.

Святло павінна падаць з левага боку, пры вячэрніх занятках неабходна спалучаць святло настольнай лямпы з агульным асвятленнем. Сядзець за сталом патрэбна прама, адлегласць ад вачэй да падручніка або канспекта павінна быць не менш 35 см, прадплеччы свабодна ляжаць на стале. Незахоўванне гэтых важных гігіенічных рэкамендацый можа прывесці да стамлення зроку, развіцця блізарукасці, парушэння паставы.

Імкніцеся быць акуратнымі ў размеркаванні свайго працоўнага часу, прывучыцеся строга выконваць рэжым дня. Толькі тады вучэбная работа будзе плённай.

**А. ДАНІЛОВІЧ,**
**кандыдат медыцынскіх навук.**



*Лістапад... А дрэвы, аголеныя свавольным ветрам, ужо застылі ў чаканні снегу. Вось адарваўся і самы апошні лісцік. Ляціць, ляціць... А вакол — нямата ствалоў...*

*Фота Я. БАРОЎСКАГА.*

# ДАПАМОГА НА ДЗЯЦЕЙ

**У сувязі са шматлікімі пытаннямі аб умовах і парадку назначэння дапамогі на дзяцей малазабяспечаным сем'ям мы друкуем сёння кансультацыю Н. Разуваевай, юрысконсульта БДУ.**

ДАПАМОГА на дзяцей уведзена з 1 лістапада 1974 года; назначаецца і выплачваецца сем'ям:

а) рабочых і служачых дзяржаўных, грамадскіх і кааператыўных прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый;

б) членаў калгасаў;

в) асоб, якія з'яўляюцца членамі творчых саюзаў (пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў);

г) ваеннаслужачых;

д) пенсіянераў;

е) навучэнцаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, вучылішчаў, школ і курсаў па падрыхтоўцы кадраў, аспірантаў і інш.

Права на атрыманне дапамогі на дзяцей маюць сем'і, у якіх сярэдні сукупны даход на члена сям'і не перавышае 50 рублёў у месяц.

Дапамога назначаецца і выплачваецца на кожнае дзіця ў размеры 12 рублёў да дасягнення ім 8-гадовага ўзросту..

Пры вызначэнні права на атрыманне дапамогі ў складзе сям'і ўлічваюцца: муж, жонка, дзеці, якія знаходзяцца на іх утрыманні і якія не дасягнулі 18 год ці старэй гэтага ўзросту, якія атрымліваюць дапамогу як інваліды з дзяцінства І ці II групы, а таксама пражываючыя сумесна іх непрацаздольныя бацькі, калі яны не атрымліваюць пенсіі і няма іншых асоб, якія абавязаны па закону іх утрымліваць.

У сукупным даходзе сям'і ўлічваюцца:

а) заработная плата, у тым ліку за звышурочную работу, за работу ў святочныя і выхадныя дні і работу па сумяшчальніцтву; надбаўкі і даплаты ўсіх відаў; прэміі, якія ўстаноўлены сістэмамі аплаты працы на гэтым прадпрыемстве, і інш.;

б) іншыя грашовыя выплаты, якія носяць сістэматычны характар (напрыклад, палявое забеспячэнне);

в) стыпендыі, пенсіі, дапамогі (акрамя разавых дапамог);

г) даходы ад уласных дапаможных гаспадарак;

д) усе віды ўзнагарод, якія выплачваюцца штатным і няштатным літаратурным работнікам, мастакам і іншым асобам з фонду аўтарскага ганарару; усе віды заработкаў адвакатаў;

е) сумы, якія выплачваюцца ў парадку пакрыцця ўрону, прычыненага знявечаннем або іншым пашкоджаннем здароўя.

Атрымліваемыя аліменты ўлічваюцца ў сукупным даходзе сям'і, а выплачваемыя аліменты выключаюцца з яго пры вызначэнні права сям'і на атрыманне дапамогі.

Сукупны даход вызначаецца па даходах сям'і за каляндарны год, які папярэднічае году звяртання за назначэннем дапамогі.

Сярэдні сукупны даход на члена сям'і ў месяц вылічваецца шляхам дзялення агульнай сумы даходаў сям'і за каляндарны год на 12 (сярэднемесячны сукупны даход сям'і), а затым на лік членаў сям'і.

Заява аб назначэнні дапамогі на дзяцей падаецца адміністрацыі прадпрыемства, установы, арганізацыі, камандаванню воінскай часці, праўленню калгаса. Непрацуючыя пенсіянеры, непрацуючыя адзінокія маці, удовы і разведзеныя жанчыны заявы аб назначэнні дапамогі на дзяцей падаюць у раённы (гарадскі) аддзел сацыяльнага забеспячэння па месцу жыхарства.

У заяве аб назначэнні дапамогі на дзяцей пералічваюцца склад сям'і і ўсе віды даходаў, якія атрымлівае сям'я.

Да заявы прыкладаюцца:

а) даведка домакіраўніцтва, ЖКК ці выканкома Савета дэпутатаў працоўных аб складзе сям'і з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, адносін радства кожнага з членаў сям'і і роду іх заняткаў;

б) копіі пасведчання аб нараджэнні дзяцей;

в) даведкі аб даходах кожнага з членаў сям'і за ўлічваемы перыяд (зарплаце, стыпендыі, пенсіі і г. д):

г) даведкі аб дзецях, якія пражываюць асобна ад сям'і.

Дапамога на дзяцей назначаецца маці па месцу яе работы ці вучобы. Калі маці не працуе і не вучыцца, дапамога назначаецца маці па месцу работы, службы ці вучобы мужа.

Сем'ям, у якіх абое працаздольныя бацькі не працуюць, дапамога на дзяцей не назначаецца.

Дапамога на дзяцей сем'ям рабочых, служачых і навучэнцаў назначаецца камісіямі па назначэнню дапамогі на дзяцей. Ва універсітэце такая камісія ўжо створана.

Пры неабходнасці больш падрабязнага азнаямлення з Палажэннем аб парадку назначэння і выплаты дапамогі на дзяцей малазабяспечаным сем'ям можна звяртацца да юрысконсульта універсітэта (пакой 1, геафак) ці ў бухгалтэрыю.

**Н. РАЗУВАЕВА,**
**юрысконсульт БДУ.**

*ЯК НЕ ТРЭБА СЯБЕ ПАВОДЗІЦЬ*

# Я І АСТАТНІЯ

Аднойчы сярод маладых людзей зайшла гаворка пра Хэмінгуэя. І калі нехта сказаў, што не любіць гэтага пісьменніка, пасыпаліся рэплікі:

— Як можна?

— Цемната!

...Спрэчкі не было, аргументаў ніякіх. Проста прыклеілі ярлык. Можа, прыхільнікі Хэмінгуэя выдатна ведаюць яго творы, але выхаванасці ім яўна не хапала.

Інтэлігентны чалавек не дазволіць сабе так адгукацца аб субяседніку. Ён і ў думках уважліва адносіцца да чужых поглядаў. Гэта, канешне, не значыць, што не трэба спрачацца: не, трэба, але рабіць гэта старайцеся далікатна.

У свой час А. П. Чэхаў напісаў брату пісьмо. У ім ён выказаў свае погляды на рысы, якія павінны быць у культурнага чалавека. Пісьмо гэта хоць і напісана даўно, але і зараз вельмі злабадзённае.

«Выхаваныя людзі, на маю думку, — пісаў Чэхаў, — павінны задавальняць наступным умовам:

1. Яны паважаюць чалавечую асобу, а таму заўсёды спагадлівыя, мяккія, ветлівыя, уступчывыя... Яны даруюць і шум, і холад, і перасмажанае мяса, і жарты, і прысутнасць у іх жыллі чужых...

2. Яны хварэюць душой і ад таго, чаго не ўбачыш простым вокам. Так, напрыклад, калі Пётр ведае, што бацька і маці сівеюць ад тугі і начэй не спяць ад таго, што яны рэдка бачаць Пятра (а калі бачаць, то п'яным), то ён паспяшаецца да іх і наплюе на гарэлку...

...3. Яны шчырыя і баяцца хлусні, як агню. Не хлусяць яны нават у дробязях. Хлусня абразліва для слухача і апашляе ў яго вачах таго, хто гаворыць. Яны не выстаўляюцца, трымаюць сябе на вуліцы гэтак жа, як дома, не пускаюць пыл у вочы меншай браціі... Яны не балбатлівыя і не лезуць з адкрытасцю, калі іх не пытаюць... З павагі да чужых вушэй яны часцей маўчаць...

Такія выхаваныя... Каб выхавацца і не стаяць ніжэй узроўню асяроддзя, у якое трапіў, недастаткова прачытаць толькі Піквіка і вызубрыць маналог з Фауста... Тут патрэбны вечнае чытанне, штудзіроўка, воля...».

Патрабаванні Антона Паўлавіча да выхаванага чалавека — высокія і разам з тым элементарныя, такія неабходныя кожнаму з нас.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА

«Белорусский университет» —орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ем — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2000 экз. АТ 05629. Заказ № 1508.